# Умацоўваць сувязі партыйных арганізацый з масамі

*С. Прытыцкі,*
*сакратар Маладзечанскага абкома КП Беларусі*

Цяпер, калі наша партыя мабілізуе ўвесь савецкі народ на ажыццяўленне намечанай ёю праграмы новага магутнага ўздыму соцыялістычнай прамысловасці, усіх галін сельскай гаспадаркі, асабліва важна далейшае расшырэнне і ўмацаванне сувязей партыйных арганізацый з масамі. У гэтым нас пастаянна пераконвае само жыццё, практыка работы прамысловых прадпрыемстваў, калгасаў, соўгасаў, МТС нашай вобласці.

За апошнія гады Маладзечанская абласная партыйная арганізацыя значна вырасла, умацавалася. Яркім паказчыкам умацавання яе аўтарытэту і ўплыву ў масах з'яўляецца рост партыйных радоў. Так, за 1955 год кандыдатамі ў члены КПСС прынята 986 чалавек, у тым ліку 154 рабочых і 380 калгаснікаў. Вялікая работа праведзена па стварэнню і ўмацаванню пярвічных партыйных арганізацый у калгасах. Калі на 1 студзеня мінулага года ў сельскагаспадарчых арцелях вобласці налічвалася 163 пярвічныя партыйныя арганізацыі, якія аб'ядноўвалі 916 комуністаў, то на 1 студзеня 1956 года працавала ўжо 475 калгасных партыйных арганізацый. На ўліку ў іх састаіць звыш 3 400 членаў і кандыдатаў у члены КПСС. Такім чынам, з наяўных у вобласці 582 калгасаў пярвічныя партыйныя арганізацыі створаны ў 475. Наяўнасць пярвічных партыйных арганізацый у сельгасарцелях дае магчымасць хутчэй ліквідоўваць наяўныя ў калгаснай вытворчасці недахопы, пераадольваць цяжкасці нашага росту, ставіць на службу народнай гаспадарцы сапраўды невычарпальныя магчымасці і рэзервы сельскагаспадарчых арцелей, павялічваць вытворчасць прадуктаў харчавання і сыравіны.

Мы дабіваемся, каб кожная партыйная арганізацыя прадстаўляла баявы, жыццедзейны калектыў, вяла за сабой масы, выступала іх сапраўдным арганізатарам. Прыкладам у гэтых адносінах могуць служыць Глыбоцкая, Браслаўская, Валожынская, Івянецкая раённыя партыйныя арганізацыі, многія пярвічныя партыйныя арганізацыі калгасаў і прадпрыемстваў вобласці. Умацоўваючы і расшыраючы сувязі з масамі, раячыся з імі па тых або іншых надзённых пытаннях, мабілізуючы працоўных на вырашэнне задач дня, гэтыя партыйныя арганізацыі дабіліся добрых вынікаў у сваёй рабоце.

Сельская гаспадарка Глыбоцкага раёна развіваецца ў тых-жа ўмовах, што і сельская гаспадарка іншых раёнаў вобласці. Яна атрымлівае аднолькавую з другімі дапамогу ад дзяржавы механізатарскімі кадрамі, тэхнікай, угнаеннямі і г. д. Глеба тут такая-ж, як і ў суседзяў. Аднак, калі мы паглядзім на вытворчыя вынікі гэтага раёна, то яны акажуцца значна лепшымі чым у другіх раёнах, у прыватнасці, у суседнім, Дунілавіцкім.

У 1955 годзе працаўнікі палёў Глыбоцкага раёна дабіліся павышэння

ўраджайнасці збожжавых у сярэднім на два цэнтнеры ў параўнанні з папярэднім годам. Некаторыя калгасы сабралі даволі высокі ўраджай. Так, у 6 паляводчай брыгадзе калгаса імя Мічурына намалочана па 120 пудоў збожжа з гектара. Паляводчыя брыгады калгаса імя Молатава, узначальваемыя тт. Качаноўскім і Вышадкевічам, сабралі ў сярэднім па 100—120 пудоў збожжавых з гектара. Такія-ж паказчыкі па збожжавых культурах маюць калгасы «17 верасня», «За Радзіму» і іншыя.

Пасевы кукурузы ў раёне расшырыліся і занялі ў мінулым годзе дзве тысячы гектараў. У сельскагаспадарчых арцелях «Зара», імя Леніна, «Савецкая Беларусь» на вялікіх плошчах пачаткі дасягнулі малочна-васкавой спеласці, атрыман нядрэнны ўраджай зялёнай масы. Гэтыя калгасы заклалі ад 11 да 14 тон кукурузнага сіласу на кожную карову. У раёне значна павысіліся ўраджаі ільну. Калі ў 1954 годзе калгасы Глыбоцкага раёна за зданую ільнопрадукцыю атрымалі 25 136 тысяч рублёў даходу, то ў 1955 годзе сума даходаў ад ільну склала прыблізна 40 мільёнаў рублёў.

Павелічэнне вытворчасці збожжа, кукурузы, бульбы дазволіла ўмацаваць кармавую базу, стварыла неабходныя ўмовы для паспяховага развіцця грамадскай жывёлагадоўлі і павышэння яе прадукцыйнасці. Многія калгасы раёна перавыканалі намечаныя планы павелічэння пагалоўя буйнай рагатай жывёлы і асабліва матачнага пагалоўя. Узрасла прадукцыйнасць дойнага статку. Ад кожнай фуражнай каровы атрымана ў сярэднім па 1 240 кілограмаў малака, г. зн. 88,9 цэнтнера на 100 гектараў угоддзяў, або на 26,1 цэнтнера больш, чым у 1954 годзе. Дасягнуты прыкметныя поспехі ў развіцці свінагадоўлі і вытворчасці свініны.

А цяпер возьмем даныя па Дунілавіцкаму раёну. Валавыя зборы збожжа тут ніжэй узроўню 1954 года. У мінулым гаспадарчым годзе на кожныя 100 гектараў угоддзяў атрымана толькі па 32 цэнтнеры малака, а надоі на карову знізіліся на 42 кілограмы. На 100 гектараў раллі атрымана ў тры разы менш свініны, чым у Глыбоцкім раёне.

Калі гэтыя два раёны знаходзяцца прыкладна ў аднолькавых умовах і маюць роўныя магчымасці, то паўстае законнае пытанне — чым-жа тады вытлумачыць іх такія розныя вытворчыя паказчыкі? Адказ можа быць адзін — розным узроўнем кіраўніцтва гаспадаркай з боку мясцовых партыйных, савецкіх і сельскагаспадарчых органаў.

Глыбоцкі раённы камітэт партыі ў сваёй штодзённай практычнай рабоце пастаянна апіраецца на пярвічныя партыйныя і камсамольскія арганізацыі, сельскія Саветы, шырокі калгасны актыў, трымае жывую сувязь з масамі. Пасля студзеньскага Пленума ЦК КПСС у калгасах і саўгасах раёна былі хутка распрацаваны канкрэтныя, добра прадуманыя мерапрыемствы па павелічэнню вытворчасці прадуктаў сельскай гаспадаркі. Гэта ўдалося зрабіць таму, што мерапрыемствы выпрацоўваліся пры актыўным удзеле калгаснага актыву і спецыялістаў сельскай гаспадаркі, абмяркоўваліся са ўсёй сур'ёзнасцю на агульных сходах калгаснікаў. Члены сельскагаспадарчых арцелей на гэтых сходах уносілі многа каштоўных прапаноў, паправак і змяненняў у намечаныя перспектыўныя планы, знаходзілі новыя рэзервы і магчымасці для развіцця гаспадаркі.

Пасля таго, як перспектыўныя планы былі зацверджаны, у раёне разгарнулася ўпорная, настойлівая барацьба за іх ажыццяўленне. Умацняючы арганізацыйную і масава-палітычную работу, паказваючы асабісты прыклад у працы, камуністы ўцягнулі ў сацыялістычнае спаборніцтва за далейшы ўздым вытворчасці шырокія масы калгаснікаў.

Раённы камітэт партыі правёў вялікую работу па ўмацаванню калгасаў энергічнымі, спрактыкаванымі кадрамі, больш уважліва пачаў прыглядацца да людзей, якія сваёй непасрэднай працай здабываюць матэ-

рыяльныя даброты — брыгадзірам, звеннявым, даяркам, цялятніцам, свінаркам, пастухам.

Поспех любой гаспадарча-палітычнай кампаніі залежыць ад таго, наколькі актыўна ўдзельнічаюць у ёй пярвічныя партыйныя арганізацыі. Гэта яны працуюць у самай гушчы мас, штодзённа і штогадзінна маюць зносіны з радавымі працаўнікамі. Вось чаму райком партыі надае асаблівае значэнне актывізацыі дзейнасці пярвічных партыйных арганізацый, клапатліва вырошчвае, выхоўвае іх сакратароў, своечасова і ўмела падказвае, на што ў даны момант трэба звярнуць галоўную ўвагу, за якое звяно трэба ўхапіцца, каб выцягнуць увесь ланцуг. Дзякуючы гэтаму і дасягаюцца станоўчыя вынікі. Калгас імя Молатава, напрыклад, доўгі час сур'ёзна адставаў у развіцці жывёлагадоўлі. Пры дапамозе райкома партыі пярвічная партыйная арганізацыя сумесна з праўленнем арцелі сур'ёзна занялася падборам і выхаваннем жывёлагадоўчых кадраў, разгарнула дзейснае спаборніцтва за дасягненне высокіх надояў малака. І становішча рэзка змянілася. Цяпер калгас імя Молатава — адна з лепшых калектыўных гаспадарак у вобласці. Даяркі гэтай арцелі Яніна Мацюшонак і Вера Грудзінская дзякуючы поспехам у працы вядомы далёка за межамі свайго калгаса.

Узнімаць ролю пярвічных партыйных арганізацый ва ўсім гаспадарча-вытворчым і палітычным жыцці прадпрыемстваў прамысловасці, калгасаў, МТС і соўгасаў, пашыраць сувязі з масамі можна пры ўмове, калі камуністы ў сваёй пераважнай большасці самі працуюць непасрэдна на вытворчасці. Браслаўская раённая партыйная арганізацыя за апошнія гады дабілася значнага ўздыму ўсіх галін сельскай гаспадаркі перш за ўсё таму, што на палях, на фермах і іншых участках вытворчасці працуе 65 працэнтаў усіх камуністаў раёна.

Іншы стыль характэрны для дзейнасці Дунілавіцкага раённага камітэта партыі. Яго работнікі часта не ўяўлялі сабе, што такое жывая арганізатарская работа ў масах. Многія з іх, прыехаўшы ў калгас, мелі справу толькі са старшынямі і іншымі кіраўнікамі арцелі, а да калгаснікаў, механізатараў — гэта значыць да тых, хто вытварае сваёй працай сельскагаспадарчую прадукцыю — не даходзілі або даходзілі рэдка, мелі зносіны з радавымі працаўнікамі часцей за ўсё на сходах або пасяджэннях. Кіраўнікі раёна праяўлялі верхаглядства ў кіраўніцтве калгасамі, не ўнікалі глыбока ў стан гаспадаркі, не займаліся выхаваннем і арганізацыяй мас. У гэтым адчувалася барскае грэбаванне будзённай, чарнавой работай, якая між тым складае аснову кіраўніцтва.

Раённы камітэт партыі і яго былы першы сакратар тав. Бедрыцкі не прыслухоўваліся да голасу радавых камуністаў. Вось характэрныя ў гэтых адносінах прыклады. Камуністы калгаса імя Булганіна пярэчылі супроць кандыдатуры Сарокіна на пост старшыні праўлення арцелі. Райком партыі, наадварот, падтрымаў гэтую кандыдатуру. І што-ж — Сарокін замест умацавання працоўнай дысцыпліны ў калгасе, заняўся непрыгожымі справамі. Калгаснікі вымушаны былі неўзабаве адхіліць яго ад займаемага паста. Ведаючы, што камуніст тав. Ванін не мае арганізатарскіх здольнасцей і іншых якасцей, неабходных для кіраўніцтва буйнай шматгалінавай гаспадаркай, бюро райкома тым не менш рэкамендавала яго старшынёй калгаса «Большэвік». Не прайшло, аднак, і года, як калгаснікі запатрабавалі адхілення Ваніна ад кіраўніцтва праўленнем, бо ён не здолеў арганізаваць уздым грамадскай гаспадаркі. Так за год у раёне змянілася 11 старшынь калгасаў.

Усё гэта не магло не прывесці да адставання раёна ў развіцці сельскагаспадарчай вытворчасці. У такім-жа стане апынуўся і Пастаўскі раён. Раённы камітэт партыі запусціў арганізатарскую і выхаваўчую

работу ў масах. Партыйныя і савецкія работнікі многа часу ўдзялялі тут падрыхтоўцы агульных дырэктыў і ўказанняў, меркавалі аб становішчы спраў на месцах не па асабістых назіраннях, а па дакладных запісках, даведках і рэзалюцыях. Райком партыі дрэнна кіраваў пярвічнымі партыйнымі арганізацыямі, не вучыў майстэрству палітычнага кіраўніцтва іх сакратароў. Таму і атрымалася, напрыклад, што партыйная арганізацыя калгаса імя Чапаева ў мінулым годзе чатыры разы абмяркоўвала на сваіх сходах пытанні развіцця жывёлагадоўлі, але становішча на фермах ад гэтага ніколькі не палепшылася. А чаму? Ды таму, што да важнай справы, да абмеркавання і распрацоўкі канкрэтных мерапрыемстваў калгасны актыў не прыцягваўся, ніхто не кантраляваў выкананне рашэнняў, якія прымаліся. Ці-ж можна было чакаць добрых вынікаў ад такой работы? Зразумела, не. У 1954—1955 гаспадарчым годзе калгас атрымаў ад фуражнай каровы усяго 481 кілограм малака — на 262 кілограмы менш, чым у папярэднім годзе.

Падобныя факты ў Пастаўскім раёне, як і ў радзе іншых раёнаў вобласці, далёка не адзінкавыя. Тут аказёнілі такую жывую, творчую справу, якой з'яўляецца сацыялістычнае спаборніцтва. Партыйныя работнікі бачаць часам асноўную сваю задачу ў тым, каб своечасова «аформіць» сацыялістычныя абавязацельствы, а аб тым, як яны выконваюцца, не думаюць. Ва многіх калгасах раёна ўзаемаправерка выканання сацыялістычных абавязацельстваў паміж паляводчымі брыгадамі, работнікамі ферм, ільнаводчымі звеннямі не наладжана. А гэта скоўвае ініцыятыву калгаснікаў, не дае ім магчымасці ведаць, хто ідзе наперадзе, а хто адстае, на каго трэба раўняцца, каму неабходна падцягнуцца і дагнаць перадавікоў.

ПРЭЗІДЭНЦКАЯ БІБЛІЯТЭКА РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

*З поўным тэкстам дакумента можна азнаёміцца ў будынку бібліятэкі*